# Выгаднае супрацоўніцтва




*Шыракавух еўрапейскі*

У кажаноў вельмі добры апетыт: кожную ноч яны з'ядаюць процьму насякомых. Прадстаўнік сярэдняга па памерах віду, з даўжынёй цела каля 5 см, за ноч з'ядае 4000 камароў.

Кажаны Еўропы — прыродныя рэгулятары колькасці насякомых, сярод якіх шмат шкоднікаў сельскай і лясной гаспадаркі. Дапамагаць кажанам — не проста экалагічна, але важна і выгадна!

# Важна!

Усе еўрапейскія віды кажаноў ахоўваюцца міжнароднымі дамовамі: EUROBATS, Бернскай і Бонскай канвенцыямі. У Беларусі ў Чырвонай кнізе знаходзяцца 8 відаў з 19, але законам ахоўваюцца ўсе віды кажаноў. За знішчэнне жывёл альбо месцаў іх пражывання прадугледжаная адміністрацыйная адказнасць.



*Начніца вадзяная*

# Сховішчы кажаноў патрабуюць аховы!

Калі вы не бачыце кажаноў, гэта не азначае, што іх няма! Звяркі могуць хавацца ў шчылінах або ў глыбокіх нішах, недаступных воку.



*Кажан позні на зімоўцы ў шчыліне падвала замка*

LE GOUVERNEMENT DU GRAND-DUCHÉ DE LUXEMBOURG
Ministère de l'Environnement, du Climat et du Développement durable

ГНПО "НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам" · АПБ · EUROBATS

**www.ptushki.org/bats**
**fb.com/kazhanapolis**
**fb.com/groups/238053956322829/**
**vk.com/kazhany_by**
**МТС, Viber: +375 29 213 92 57**

Тэкст: А. Шпак, Л. Годлеўська, М. Савченко, П. Воробей, А. Башарымава
Фота: Л. Годлеўська

## ПАДЗЕМНЫЯ КВАТЭРЫ
# кажаноў



*Вушан буры*

**Падзямеллі — важны тып сховішчаў для кажаноў. У Беларусі іх насяляюць, сезонна ці цягам круглага года, 12 з 19 відаў гэтых жывёл.**

# Кажаны…



Або рукакрылыя — адзіныя сысуны, здольныя да актыўнага палёту.

Не маюць дачынення да грызуноў, а складаюць асобны атрад сысуноў;

у Беларусі жыве 19 відаў рукакрылых.

Кажаны Еўропы, у тым ліку Беларусі, сілкуюцца выключна членістаногімі (пераважна насякомымі, а таксама павукамі, сенакосцамі, мнаганожкамі).

Кажаны маюць вельмі нізкія тэмпы размнажэння: самка прыносіць толькі 1–2 дзіцяняты на год, многія з якіх не выжываюць.

З'яўляюцца індыкатарамі якасці навакольнага асяроддзя: скарачэнне іх колькасці кажа пра пагаршэнне экалагічнай сітуацыі.

Уразлівыя і ахоўныя жывёлы, іх выжыванне залежыць ад добрага стаўлення чалавека.




*Начніцы, Натэрэра і вадзяная на зімоўцы*

# Дзе жывуць кажаны?

Кажаны не здольныя будаваць сховішчы, а выкарыстоўваюць у якасці кватэр дрэвы, расколіны ў скалах, пабудовы і сутарэнні (пячоры, скляпенні, закінутыя фартыфікацыі, горныя выпрацоўкі і г. д.).

Выкарыстанне сховішчаў залежыць ад пары года. Улетку жывёлы засяляюць цёплыя месцы, якія добра праграюцца. Зімой, у перыяд спячкі, — прахалодныя, са стабільнай тэмпературай, у сярэднім, ад 0 да +10°C.





*Вушан шэры на зімоўцы, вушкі схаваныя пад крыламі*

У прахалодных сутарэннях, якія не прамярзаюць, — аптымальныя ўмовы для зімовай спячкі кажаноў. Спячка дапамагае ім перажыць зімовую бяскорміцу. У гэты перыяд звяркі вельмі ўразлівыя і мусяць эканоміць запасы тлушчу, набраныя за лета. Любое турбаванне можа іх абудзіць, а гэта пагражае стратай вялікай колькасці энергіі і гібеллю. Сонных кажаноў нельга турбаваць (асвятляць, дакранацца, доўга знаходзіцца побач), будзіць і перамяшчаць.

У цёплых сутарэннях у канцы вясны самкі фармуюць вывадкавыя, або мацярынскія, калоніі. Улетку ў іх нараджаюцца і растуць маладыя звяркі. Такія калоніі вельмі ўразлівыя.

Не ўсе сутарэнні аднолькавыя — там павінны быць аптымальныя ўмовы для спячкі, вывядзення патомства, лятавання, сустрэч і зносін. Такіх сховішчаў няшмат, таму кожнае з іх мае вялікую каштоўнасць для кажаноў.

Важна разумець: перайначванне ўваходаў у сутарэнне або яго ўладкавання можа зрабіць яго непрыдатным для кажаноў ці нават прывесці да іх гібелі.

Кажаны вельмі прывязаныя да сваіх падземных «кватэр». Адно сутарэнне можа быць домам для многіх рукакрылых, якія ляцяць з розных, у тым ліку аддаленых, рэгіёнаў. Таму турбаванне звяркоў у адным сховішчы можа мець цяжкія экалагічныя наступствы нават для тэрыторый, якія знаходзяцца ад яго на вялікай адлегласці.



*Начніцы Натэрэра на зімоўцы ў падземным бункеры*

# У гасцях у кажаноў

Калі ў вас у склепе зімуе кажан — гэта добрае суседства, і для чалавека яно бяспечнае.

Наведванне ж сутарэнняў, у якіх жыве шмат кажаноў, патрабуе асаблівай адказнасці. Рукакрылыя — далікатныя і ўразлівыя жывёлы. Нават простае знаходжанне чалавека побач з імі можа прывесці да іх турбавання і гібелі.

## Кажаны маюць патрэбу ў нашай павазе і добрым стаўленні!

Прынцыпы аховы падземных сховішчаў рукакрылых, а таксама прыклады з розных еўрапейскіх рэгіёнаў — у дапаможніку EUROBATS: bit.ly/39089MK



*Начніцы вадзяныя на зімоўцы*